# ДЗЕЙНАСЦЬ СЕРЖЫУ ВІЕЙРА ДЭ МЭЛУ (1948–2003 гг.) У ГУМАНІТАРНЫХ МІСІЯХ ААН У КАМБОДЖЫ (1991–1993 гг.) І ЮГАСЛАВІІ (1993 г.)

***К. А. Місюкевіч***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск;*
*artintellige@gmail.com*;
*навук. кір.* – С. Ф. Свілас*, д-р гіст. навук, дац.*

У дадзеным артыкуле на падставе дакументаў ААН і публіцыстычных крыніц, прысвечаных бразільскаму дыпламату і лаўрэату Прэміі ААН у галіне правоў чалавека Сержыу Віейра дэ Мэлу, разглядаецца яго дзейнасць у гуманітарных місіях ААН у Камбоджы і Босніі, якія былі аднымі з першых у яго дыпламатычнай кар’еры. Аўтар мае мэту падкрэсліць уклад Сержыу Віейра дэ Мэлу у дзейнасць ААН непасрэдна на “палях”, а таксама складанасць і неадназначнасць рашэнняў, якія ён мусіў прымаць падчас яе. У працы над артыкулам выкарыстоўваюцца антрапалагічны падыход і бібліяграфічны метад. Тэма ўпершыню разглядаецца ў беларускай гістарыяграфіі. Яе актуальнасць абумоўлена інтэнсіфікацыяй беларуска-бразільскіх двухбаковых адносін. Матэрыялы артыкула могуць быць карыснымі ў даследчыцкай і педагагічнай працы.

***Ключавыя словы:*** Арганізацыя Аб’яднаных Нацый; бежанцы; гуманітарная місія; дыпламатыя; Сержыу Віейра дэ Мэлу.

Сержыу Віейра дэ Мэлу, безумоўна, з’яўляецца адной з найбольш яскравых фігур бразільскай дыпламатыі сучаснасці. Адпрацаваўшы ў Арганізацыі Аб’яднаных Нацый больш за 30 гадоў, Віейра дэ Мэлу пакінуў своей след у гісторыі, у прыватнасці, дзякуючы адданасці гуманізму і перакананасці ў неабходнасці правядзення мірных перамоў з улікам інтарэсаў усіх уцягнутых бакоў, незалежна ад іх культурнай, ідэалагічнай і палітычнай арыентацыі [3]. Ён заплаціў самую высокую цану за свае перакананні, прынцыпы і адданасць справе забеспячэння лепшага жыцця для бяспраўных і безгалосых ахвяр чалавечай жорсткасці. Згодна з меркаваннем міністра замежных спраў Бразіліі ў 2011–2013 гг. Антоніу Патрыота, дзейнасць Сержыу Віейра дэ Мэлу адлюстроўвае лепшыя рысы бразільскага нацыянальнага характару, а здольнасць да дыялогу з усімі бакамі, якую дэманстраваў Віейра дэ Мэлу, павінна служыць прыкладам дыпламатам будучых пакаленняў [5].

Сержыу Віейра дэ Мэлу нарадзіўся 15 сакавіка 1948 г. ў Рыа-дэ-Жанейра, Бразілія. З ранняга ўзросту ён жыў за мяжой, бо яго бацька знаходзіўся на дыпламатычнай службе. Віейру дэ Мэлу скончыў сярэднюю школу ў ліцэі Франка-Бразіліі ў сваім родным горадзе. У 1966 г., імкнучыся быць бліжэй да свайго бацькі, які ў той час быў генеральным консулам у Штутгарце, Германія, Сержыу пераехаў у

Швейцарыю, каб вывучаць філасофію ва Універсітэце Фрыбурга. Пасля ён пераехаў у Парыж для працягу адукацыі, атрымаўшы ступень бакалаўра ў 1969 г. і ступень магістра па філасофіі ў 1970 г. ва Універсітэце Сарбона.

Непрадузятасці Сержыу Віейра дэ Мэлу ў вырашэнні канфліктаў спрыяла тое, што ён, з'яўляючыся сынам дыпламата, правёў свае маладыя гады ў вандроўках, вывучаючы іншыя мовы і культуры. Свае першыя крокі ў дыпламатычнай кар'еры Віейру дэ Мэлу зрабіў ва ўзросце 21 года, патрапіўшы ва Упраўленне Вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў, дзейнасць якога засяроджана на абароне бежанцаў увогуле і, больш канкрэтна, на супрацоўніцтве з дзяржавамі, што падпісалі Канвенцыю аб статусе бежанцаў 1951 г. і Пратакол 1967 г., якія павінны забяспечыць гэтую абарону [6].

Сярод першых задач маладога дыпламата вылучаюцца яго ўдзел у палявых місіях у Бангладэш у 1971 г., падчас якіх Віейра дэ Мэлу аказваў дапамогу ў размеркаванні харчавання, а таксама ў аперацыі ў Судане (1972–1973 гг.), дзе ён меў магчымасць непасрэднага ўдзелу ў дастаўцы па паветры бытавых тавараў і харчаванняя для суданскіх бежанцаў, што былі рэпатрыяваныя пасля падпісання мірнага пагаднення з паўднёвымі паўстанцамі пасля 17 гадоў грамадзянскай вайны. У першае дзесяцігоддзе дыпламатычнай кар'еры Віейра дэ Мэлу таксама ўдзельнічаў у місіях на Кіпры, у Мазамбіку і Радэзіі [3].

У 1983 г. Віейра дэ Мэлу быў назначаны на пасаду намесніка Кофі Анана, які на той час узначальваў Дэпартамент кадраў УВКБ ААН. Аднак адважнасць і цвёрдасць духа дыпламата вызначылі яго жаданне і гатоўнасць знаходзіцца непасрэдна ў эпіцэнтры падзей. Так, пасля дзесяцігадовай працы пры штаб-кватэры УВКБ у Жэневе, Віейра дэ Мэлу, у якасці спецпрадстаўніка Вярхоўнага камісара, апынуўся ў Камбоджы (1991 г.). Там дыпламата чакала місія, што вымагала прыняцця надзвычай складаных рашэнняў – рэпатрыяцыя камбаджыйскіх бежанцаў. Складанасць задачы была абумоўленая колькасцю наземных мін і неразарваўшыхся боепрыпасаў, што прадстаўлялі вялікую небяспеку для рэпатрыянтаў.

Абраўшы шлях, напоўнены рызыкамі і небяспекай, Віейра дэ Мэлу сутыкнуўся з крытыкай з боку сваіх калег і абвінавачаннямі ў неасцярожнасці і паспешнасці. Яны лічылі бяздумным кідаць грамадзянскае насельніцтва ў камбаджыйскую мясцовасць з яе міннымі палямі. Аднак Віейра дэ Мэлу пярэчыў, што лёс насельніцтва павінен вырашацца не УВКБ, а непасрэдна рэпатрыянтамі. Для дыпламата было надзвычай важна паважаць і падтрымліваць меркаванне людзей, што дабраахвотна ўступілі на небяспечны шлях рэпатрыяцыі [4].

Сваю смеласць Сержыа Віейру дэ Мэлу праявіў таксама і праз дэманстрацыю гатоўнасці да перамоваў з “чырвонымі кхмерамі” напрамую, паколькі шмат бежанцаў непазбежна мусілі рэпатрыіравацца на землі, размешчаныя на тэрыторыі, якія кантраляваліся гэтай радыкальнай мааісцкай групоўкай [6]. Перамовы прайшлі паспяхова: дыпламат дамовіўся аб заключэнні абавязковага пагаднення, якое прывяло да перасялення каля 370 тысяч камбаджыйскіх бежанцаў. Такім чынам, Віейра дэ Мэлу стаў першым і адзіным прадстаўніком ААН, які правёў перамовы з “чырвонымі кхмерамі”, – прыхільнікамі аднаго з самых крывавых таталітарных рэжымаў у гісторыі чалавецтва.

Досвед працы ў Камбоджы навучыў Сержыу Віейра дэ Мэлу выкарыстоўванню гуманітарных аспектаў для дасягнення палітычнага ўплыву, бо дыпламат разумеў, што палітычны шлях можа стаць эфектыўным інструментам для пераадольвання ўсіх выклікаў, у т. л. гуманітарных. Неўзабаве Віейра дэ Мэлу быў назначаны палітычным саветнікам Спецыяльнага прадстаўніка Генеральнага Сакратара ў былой Югаславіі (1993 г.) [3]. Вайна ў Босніі была адным з самых жорсткіх і зацяжных канфліктаў у Еўропе з часоў Другой сусветнай вайны, які працягваўся больш за 3 гады і прывёў да гібелі каля 200 тысяч чалавек. Сярод ахвяр вайны каля 30% складалі жанчыны і дзеці. Для суправаджэння гуманітарных работнікаў з мэтай аказання дапамогі грамадзянскаму насельніцтву, што апынулася ў пастцы ў разгар канфлікту, Саветам Бяспекі былі створаны Сілы Арганізацыі Аб’яднаных Нацый па ахове (СААНА).

Галоўнай задачай СААНА стала ўтварэнне гуманітарнага паветранага моста ў Сараева, які быў акружаны сербскімі снайперамі. У гэтай місіі Віейра дэ Мэлу зноў паказаў сябе як прыхільніка гуманізму, гатовага абараняць інтарэсы мясцовага насельніцтва. Дыпламат лічыў найбольш важным выратаваць іх жыццё, а таксама выйграць час для прасоўвання мірных перамоваў. Калі б СААНА адказалі на агрэсію сербаў, жыцці мільёнаў людзей маглі апынуцца пад пагрозай. Менавіта такое рашэнне Віейра дэ Мэлу падвергнулася крытыцы, якая ўзмацнялася па меры нападаў сербаў на грамадзянскае насельніцтва: лічылася, што Віейра дэ Мэлу хутчэй назірае за ходам вайны, а не займаецца міратворчасцю. Аднак дзейнасць дыпламата ўсё ж такі прынесла пэўную карысць: у сакавіку 1994 г., пасля перамоваў даўжынёй у ноч, Віейра дэ Мэлу дабіўся адкрыцця чатырох маршрутаў, па якіх грамадзянскае насельніцтва Сараева, упершыню з пачатку вайны ў 1992 г., змагло свабодна перасоўвацца [3].

Апрача вернасці прынцыпам гуманізму, бразільскі дыпламат імкнуўся кіравацца прынцыпам непрадузятасці. Кіруючыся рэзалюцыямі Савета Бяспекі 814 і 819 [1; 2], Віейра дэ Мэлу падкрэсліваў, што СААНА не маглі

браць на сябе ролю актыўнага ваеннага абаронцы, суадносна, нягледзячы на жорсткасць сербскіх нападаў, варта было захоўваць поўную непрадузятасць. Аднак пасля прыняцця Саветам Бяспекі рэзалюцыі 836 ад 4 чэрвеня 1993 г., праз тры дні пасля разні ў Срэбраніцы, СААНА атрымалі паўнамоцтвы для стрымлівання нападаў на т. зв. “зоны бяспекі”. Захаванне непрадузятасці больш не бачылася магчымым, гэта ставіла пад пагрозу само ажыццяўленне гуманітарнай місіі. У выніку, адпаведную функцыю узяло на сябе НАТА, правёўшы першую інтэрвенцыю на Балканах, што Віейра дэ Мэлу неахвотна падтрымаў [3].

Праз узначальванне сваіх першых гуманітарных місій, Сержыу Віейра дэ Мэлу паказаў сябе не толькі як высокакваліфікаваны дыпламат, гатовы кінуць выклік пагрозам у гуманітарнай сферы ў самых праблемных рэгіёнах свету, але і як асоба, якая цалкам прысвяціла сябе служэнню чалавецтву, улічваючы патрэбы і інтарэсы менавіта мясцовага насельніцтва, што паказвае рашэнне Віейра дэ Мэлу любым коштам прайсці праз небяспечную мясцовасць дзеля выратавання людскіх лёсаў. Дзейнасць дыпламата ў Босніі сведчыць пра тое, што рашэнні ён прымаў асцярожна, беручы да ўвагі каштоўнасць чалавечага жыцця. Такім чынам, самаахвярная дзейнасць Сержыу Віейра дэ Мэлу стала важнай старонкай як дыпламатычнай гісторыі яго радзімы – Бразіліі, так і Арганізацыі Аб’яднаных Нацый увогуле.

БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ


1. Рэзалюцыя Савета Бяспекі ААН № 814 26.03.1993 г. [Электронны рэсурс] // Арганізацыя Аб’яднаных Нацый. – Рэжым доступу: https://daccess-ods.un.org/tmp/5605372.19047546.html. – Дата доступу: 07.10.2022.

2. Рэзалюцыя Савета Бяспекі ААН № 819 26.03.1993 г. [Электронны рэсурс] // Арганізацыя Аб’яднаных Нацый. – Рэжым доступу: https://daccess-ods.un.org/tmp/538002.625107765.html. – Дата доступу: 07.10.2022.

3. Andrés Ramirez. Sérgio Vieira de Mello: O funcionário indispensável das nações unidas / A. Ramirez [Recurso eletrônico]. – Modo de acesso: https://revistas.ufpr.br/direito/article/view/36346. – Data de acesso: 07.10.2022.

4. Julia Macedo, João Sallani, Fabrizio Jacobucci. Entre a utopia e o realismo: o legado de Sergio Vieira de Mello para as missões de paz da ONU [Recurso eletrônico] // Cosmopolita. – Modo de acesso: https://www.cosmopolita.org/post/entre-a-utopia-e-o-realismo-o-legado-de-sergio-vieira-de-mello-para-as-miss%C3%B5es-de-paz-da-onu. – Data de acesso: 07.10.2022.

5. Seminário marca os 10 anos da morte de Sérgio Vieira de Mello [Recurso eletrônico] // Organização das Nações Unidas. – Modo de acesso: https://news.un.org/pt/story/2013/08/1446951. – Data de acesso: 07.10.2022.

6. Summary of his major achievements. [Recurso eletrônico] // Sergio Vieira de Mello Foundation. – Modo de acesso: http://www.sergiovdmfoundation.org/about-sergio/achievements/. – Data de acesso: 07.10.2022.